## *АЎТЭНТЫЧНЫ ФАЛЬКЛОР БЕЛАРУСАЎ У ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ*

**М. Л. Кузьмініч,** *прафесар*
*БДУ культуры і мастацтваў*

# СТАНДАРТ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ (ФАЛЬКЛОР)" ЯК МАДЭЛЬ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ДЛЯ ГАЛІНЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь вызначаюцца захаванне і развіццё традыцыйнай культуры беларускага народа, якая выступае дзейсным сродкам этнакультурнага выхавання асобы, невычэрпнай крыніцай прафесійнай і аматарскай мастацкай творчасці, культурным генафондам беларускай нацыі. Важнейшым фактарам рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца забеспячэнне сферы культуры і мастацтва высокакваліфікаванымі кадрамі з вышэйшай адукацыяй.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў – вядучая вышэйшая навучальная ўстанова ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў сферы культуры. Гэта буйны адукацыйны, культурна-асветны і навукова-даследчы цэнтр краіны, які прымае актыўны ўдзел у выкананні галіновай праграмы "Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.", у прыватнасці яе раздзела "Кадры культуры" (рашэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 30.05.2006 г. № 40). Гэта работа вядзецца ў кантэксце праектавання стандартаў вышэйшай адукацыі новага пакалення ў межах Праграмы пераходу на дыферэнцыраваныя тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у РБ на 2005–2010 гг. (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2005 г. № 755).

Удасканаленне практыкі падрыхтоўкі спецыялістаў здзяйсняецца на падставе палажэнняў Балонскага працэсу, рэалізацыі кампетэнтнага падыходу ў адукацыі з улікам арыентацыі на вынікі вучэбна-выхаваўчага працэсу, на фарміраванне вызначанай кампетэнцыі будучага спецыяліста.

Ва універсітэце створана рабочая група па распрацоўцы новага адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці “народная творчасць (фальклор)”. Мэтай дзейнасці рабочай групы стала мадэліраванне навучальнага працэсу ў вышэйшай навучальнай установе, які забяспечыць фарміраванне і развіццё акадэмічнай кампетэнцыі, што ўключае веды і ўменні па вывучаных дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца; сацыяльна-асобасную кампетэнцыю, што прадугледжвае, у прыватнасці, культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веданне ідэалагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы і ўменне адпавядаць ім; прафесійную кампетэнцыю, якая ўключае веды і ўменні фармуляваць праблемы, вырашаць задачы, распрацоўваць планы і забяспечваць іх выкананне ў абранай сферы прафесійнай дзейнасці.

Сферы прафесійнай дзейнасці спецыяліста – культура, адукацыя, навука. Аб’ектамі яго прафесійнай дзейнасці з’яўляюцца прафесійныя і аматарскія творчыя калектывы, установы культуры, агульнаадукацыйныя школы з мастацкім ухілам, сярэднеспецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы, эстэтычныя цэнтры і цэнтры народнага мастацтва, установы пазашкольнага навучання і выхавання.

Выпускнік ВНУ павінен быць кампетэнтным па наступных кірунках дзейнасці: арганізацыйна-кіруючай, выканальніцкай, педагагічнай, даследчай.

Кола яго прафесійных задач ахоплівае:

– эстэтычнае выхаванне і фарміраванне высокамастацкіх густаў насельніцтва;

– выкарыстанне ў творчасці этнаэкалагічнага патэнцыялу народнай культуры;

– выкарыстанне прыёмаў тэхналагічна-творчага забеспячэння мастацтва;

– арганізацыю вучэбна-пазнавальнай і творчай дзейнасці ва ўстановах культуры, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання;

– кіраванне вучэбна-пазнавальнай і творчай дзейнасцю ва ўстановах культуры, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання;

– кіраванне прафесійнымі і аматарскімі творчымі калектывамі;

– рэгуляванне зносін і ўзаемадзеянняў у творчым і педагагічным працэсах;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкарыстанне аптымальных формаў, метадаў, сродкаў навучання і выхавання.

Выпускнік абавязаны мець дастатковы ўзровень ведаў і ўменняў у сферы сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўча-навуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, дысцыплін спецыялізацыі для ажыццяўлення сацыяльна-прафесійнай дзейнасці і бесперапынна папаўняць свае веды. Будучы спецыяліст павінен умець аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця грамадства, ведаць ідэалогію беларускай дзяржавы, маральныя і прававыя нормы і ўмець прымяняць іх на практыцы. Выпускнік павінен валодаць дзяржаўнымі мовамі (беларускай, рускай), адной ці некалькімі замежнымі мовамі, быць гатовым да пастаяннага прафесійнага, культурнага і фізічнага самаўдасканалення.

Выпускнік авалодвае наступнымі навыкамі:

– выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных, практычных і творчых задач;

– умець працаваць самастойна і вырашаць прафесійныя пытанні;

– ажыццяўляць актыўную прафесійную дзейнасць, быць здольным прапаноўваць новыя ідэі (крэатыўнасць);

– мець лінгвістычныя навыкі (вусная і пісьмовая камунікацыі);

– выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для захавання і развіцця народнай творчасці як асновы этнаэкалогіі народа;

– пастаянна павышаць сваю кваліфікацыю, ведаць месца і ролю сваёй прафесійнай дзейнасці ў культурным жыцці грамадства.

Будучы спецыяліст павінен валодаць сацыяльна-асобаснай кампетэнцыяй, у прыватнасці:

– валодаць грамадзянскімі якасцямі;

– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

– валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

– мець навыкі беражлівах адносін да свайго здароўя;

– быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне);

– умець працаваць у калектыве.

Пасля заканчэння ВНУ выпускнікі набываюць прафесійныя веды па наступных відах дзейнасці.

**1. Арганізацыйна-кіруючая дзейнасць.**

Будучы спецыяліст авалодвае ўменнямі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– працаваць з юрыдычнай літаратурай і працоўным заканадаўствам;

– арганізоўваць работу творчых калектываў для дасягнення пастаўленых мэт і задач, планаваць фонды аплаты працы;

– кантраляваць і падтрымліваць працоўную і вытворчую дысцыпліну;

– распрацоўваць дакументацыю (інструкцыі, планы, заяўкі, дзелавыя паперы і інш.), а таксама справаздачную дакументацыю па ўсталяваных формах;

– узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў;

– весці перамовы, распрацоўваць кантракты з зацікаўленымі асобамі і арганізацыямі;

– рыхтаваць даклады, матэрыялы да выступленняў і ўдзельнічаць у іх;

– карыстацца глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі;

– валодаць сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый.

**2. Выканальніцкая дзейнасць.**

Выпускнік павінен быць здольны:

– планаваць тэматыку (рэпертуар) уласных мастацкіх твораў з улікам этнаэкалагічнага патэнцыялу народнай творчасці і яе дакументальнай (аўтэнтычнай) асновы;

– працаваць з крыніцамі тэматыкі і рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці;

– арганізоўваць працэс выканання мастацкіх (у тым ліку тэатральных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва;

– кантраляваць і падтрымліваць на дастатковым узроўні ўласны выканаўчы мастацкі ўзровень;

– узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў;

– весці перамовы па арганізацыі выканальніцкай дзейнасці;

– карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі па ўдакладненні сучасных умоў, зместу і сацыяльнай запатрабаванасці выканальніцкай дзейнасці;

– валодаць сучаснымі сродкамі тэхнічнага забеспячэння выканальніцкай дзейнасці;

– рыхтаваць у працэсе выканальніцкай практыкі якасную творчую змену.

**3. Педагагічная дзейнасць.**

Выпускнік павінен валодаць уменнямі і навыкамі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання сродкамі народнай (у тым ліку тэатральнай) творчасці;

– планаваць працэс навучання і выхавання ў адпаведнасці з распрацаванымі нарматыўнымі і дыдактычнымі дакументамі;

– наладжваць вучэбны і выхаваўчы працэс з улікам этнаэкалагічнага патэнцыялу народнай творчасці і яе дакументальнай (аўтэнтычнай) асновы;

– састаўляць планы вучэбных заняткаў, весці журнал наведвання і паспяховасці ў адпаведнасці з устаноўленай формай;

– кантраляваць і падтрымліваць вучэбную дысцыпліну навучэнцаў і выкананне імі правілаў унутранага распарадку ўстановы;

– улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход для вырашэння мэт і задач навучання і выхавання;

– карыстацца прыёмамі заахвочвання навучэнцаў да паспяховага дасягнення мэт і задач навучання і выхавання, а таксама да творчага самаўдасканалення;

– узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў;

– выкарыстоўваць сучасныя тэхнічныя сродкі навучання;

– рыхтаваць і ажыццяўляць справаздачныя заняткі па вучэбным прадмеце ў форме творчых паказаў, відовішчаў, тэатральных спектакляў;

– карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў дыдактыцы навучання;

– удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства;

– абапірацца ў педагагічнай дзейнасці на дасягненні айчыннай і замежнай педагагічнай навукі і практыкі ў галіне тэатральнага мастацтва;

– выкарыстоўваць у педагагічнай дзейнасці стратэгію развіцця творчага патэнцыялу асобы навучэнца сродкамі тэатральнай педагогікі;

– прымяняць у працэссе выкладання спецыяльных тэатральных дысцыплін сістэму ведаў па прафесійнай педагогіцы з мэтай выхавання асобасна-творчых якасцей навучэнца.

**4. Даследчая дзейнасць.**

Выпускнік абавязаны:

– аналізаваць перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці як аднаго са складальнікаў этнаэкалогіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– распрацоўваць апытальнікі для збору звестак па народнай творчасці;

– ажыццяўляць нагляд за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы і пераемнасці;

– разлічваць і аналізаваць неабходныя для аховы і развіцця народнай творчасці выдаткі;

– планаваць асноўныя этапы навуковых даследаванняў народнай творчасці;

– арганізоўваць работу па падрыхтоўцы навуковых артыкулаў, паведамленняў, рэфератаў і заявак на фінансаванне навуковых і адукацыйных праектаў па народнай творчасці і тэатральным мастацтве і асабіста ўдзельнічаць у ёй;

– рыхтаваць праектную дакументацыю і каштарысы на правядзенне навукова-даследчай дзейнасці ў галіне народнай (у тым ліку тэатральнай) творчасці;

– прымаць удзел у навуковых даследаваннях па гісторыі і тэорыі тэатральнага мастацтва і рэжысуры;

– на навуковай аснове арганізоўваць сваю творчую прафесійную (рэжысёрскую) дзейнасць, валодаць навейшымі навуковымі распрацоўкамі, а таксама сучаснай інфармацыяй у сферы тэатральнага мастацтва;

– выкарыстоўваць у асабістай прафесійнай дзейнасці новыя дасягненні тэорыі і практыкі ў галіне тэатральнай рэжысуры.

Прапанаваны рабочай групай вучэбны план па спецыяльнасці “народная творчасць (фальклор)” уключае сацыяльна-гуманітарныя, навукова-прыродазнаўчыя, а таксама агульна-прафесійныя і спецыяльныя прадметы, сярод якіх “Этнапедагогіка”, “Этнафонія спеўнай суполкі”, “Нематэрыяльная традыцыйная культура беларусаў”, “Практычная этнафонія (спевы)”, “Аўдыёвізуальная антрапалогія”, “Клас фальклорнага выканаўчага майстэрства”, а таксама прадметы кампанента ВНУ (2 прадметы), дысцыпліны і курсы па выбары (3 прадметы).

На дысцыпліны спецыялізацый адводзіцца больш за 700 гадзін. Студэнты праходзяць вучэбную, вытворчую, педагагічную, фальклорную і пераддыпломную практыку, вывучаюць факультатывы.

Вызначаючы кампетэнцыю выпускніка, якая фарміруецца ў межах канкрэтных дысцыплін вучэбнага плана, члены рабочай групы абапіраліся на наступныя вызначэнні паняццяў “народная творчасць” і “фальклор”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Народная творчасць – сукупнасць відаў калектыўнай мастацкай творчай дзейнасці народа па стварэнні, вывучэнні, захаванні, узнаўленні і распаўсюджванні, успрыманні, выкарыстанні твораў непрафесійнага мастацтва, якая адлюстроўвае яго жыццё, погляды, ідэалы; а таксама сукупнасць мастацкіх твораў (каштоўнасцей) разнастайных відаў і жанраў, створаных некалькімі пакаленнямі, што бытуе (бытавала) у асяродку народа і ў якой знайшлі адлюстраванне яго сацыяльны вопыт, этычны і эстэтычны ідэалы.

Фальклор – сукупнасць светапоглядных каштоўнасцей і мастацтва, якая ў першапачаткова характэрных для яе межах бытавання – руральных (вясковых) асяродках – перадаецца прынцыпова непісьмовым шляхам (шляхам вуснай перадачы) і пры забеспячэнні яе пераймання ў народзе складае аснову яго этнаэкалогіі.

Змест падрыхтоўкі спецыяліста прадстаўлены ў вучэбным плане сацыяльна-гуманітарнымі, навукова-прыродазнаўчымі, агульнапрафесійнымі і спецыяльнымі блокамі дысцыплін, вывучэнне якіх забяспечвае фарміраванне ў выпускніка неабходнай кампетэнцыі.

Важным у падрыхтоўцы сучаснага спецыяліста застаецца веданне ім сацыяльна-гуманітарных і навукова-прыродазнаўчых дысцыплін, якія вывучаюцца студэнтамі ўсіх спецыяльнасцей.

Цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін у першую чаргу забяспечвае фарміраванне і развіццё прафесійнай кампетэнцыі спецыяліста.

Так, у выніку вывучэння дысцыпліны “Педагогіка” выпускнік павінен *ведаць* асноўныя тэарэтычныя палажэнні педагогікі, асноўныя катэгорыі педагогікі і сутнасць працэсаў адукацыі, прынцыпы і тэхналогію выхавання як працэсу сацыялізацыі асобы, метады і формы выхаваўчага ўздзеяння на ўдзельнікаў творчых калектываў у залежнасці ад узросту і індывідуальных якасцей, асобасна арыентаваныя педагагічныя тэхналогіі выхавання ва ўстановах сацыякультурнай сферы; *умець* выкарыстоўваць методыкі дыягностыкі і развіцця творчых якасцей асобы ва ўмовах навучальнага працэсу і ў сферы вольнага часу, самастойна карыстацца педагагічнымі ведамі, уменнямі, навыкамі ў прафесійнай педагагічнай дзейнасці, рэалізоўваць педагагічную дзейнасць ва ўстановах культуры, арганізоўваць выхаваўчую работу з рознымі катэгорыямі ўдзельнікаў творчых калектываў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працэсе вывучэння дысцыпліны “Псіхалогія” (агульная, сацыяльная, узроставая і мастацкай творчасці) будучы спецыяліст засвойвае асноўныя тэарэтычныя палажэнні псіхалогіі, асноўныя катэгорыі псіхалогіі ў кантэксце працэсаў адукацыі і выхавання, псіхалагічныя працэсы, станы, уласцівасці асобы і спосабы педагагічнага ўздзеяння на іх ва ўстановах культуры, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання, прычыны дзелавых, асобасных і міжасобасных канфліктаў і тэхналогію іх вырашэння ва ўмовах творчых калектываў, псіхалагічныя асаблівасці стыляў кіравання ў кантэксце дзейнасці творчых калектываў; *умець* характарызаваць заканамернасці і прынцыпы фарміравання і развіцця асобы ў розных відах творчай і мастацкай дзейнасці, выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі фарміравання вядучых якасцей асобы ў асяродку ўдзельнікаў творчых калектываў, выкарыстоўваць методыкі дыягностыкі і развіцця творчых якасцей асобы ва ўмовах навучальнага працэсу і ў сферы вольнага часу, самастойна карыстацца ведамі па псіхалогіі ў прафесійнай дзейнасці.

Вывучэнне дысцыпліны “Беларуская і сусветная літаратура” дапамагае выпускніку *засвоіць* месца і ролю мастацкай літаратуры ў культуралагічным кантэксце, спецыфіку мастацкай літаратуры як формы спасціжэння свету, сувязі і ўзаемаўплывы літаратуры і іншых відаў мастацтва, творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох; *умець* характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця, вызначаць спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу, успрымаць літаратурны твор ва ўзаемасувязі гісторыі і сучаснасці, самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка, выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай дзейнасці.

У выніку засваення дысцыпліны “Культурная антрапалогія” выпускнік павінен *ведаць* асноўныя заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва, марфалогію культуры, асаблівасці менталітэту народаў, сэнс базавых сімвалаў сусветнай і нацыянальнай культуры, праблемы міжкультурных камунікацый ў кантэксце глабалізацыйных працэсаў, прыкладныя магчымасці культурнай антрапалогіі ў сацыякультурнай сферы; *умець* крытычна ўспрымаць тэндэнцыі, сімвалы, плыні, феномены сусветнай і нацыянальнай культуры, аналізаваць гістарычную разнастайнасць тэкстаў культуры, ацэньваць асаблівасці міжкультурных камунікацый, ажыццяўляць самастойны пошук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходнай інфармацыі для папаўнення ведаў аб культуры, адаптавацца ва ўмовах мультыкультурнай сітуацыі, выкарыстоўваць культурнаантрапалагічныя веды ў сферы сацыякультурнай дзейнасці.

У выніку засваення дысцыпліны “Гісторыя мастацтваў” выпускнік абавязаны *ведаць* сэнс і прызначэнне розных відаў мастацтва, вобразную мову кожнага віду, відавую і жанравую тыпалогію, гісторыю мастацкай культуры свету ў адпаведнасці з эпохамі, стылямі і школамі, асноўныя гістарычныя факты, падзеі, даты, імёны дзеячаў мастацтва, мастацкую культуру Беларусі і творчасць кампазітараў, мастакоў, дзеячаў тэатра і кіно, развіццё сучасных драматычных і музычных тэатраў; *умець* аналізаваць заканамернасці фарміравання розных відаў мастацтва ў пэўныя эпохі, валодаць катэгарыяльным апаратам, спецыфічнай мовай розных відаў мастацтва, вызначаць, супастаўляць, параўноўваць асаблівасці аўтарскіх стыляў, аналізаваць творы мастацка-матэрыяльнай культуры, канструяваць, аналізаваць, здзяйсняць на практыцы працэс выкладання тэорыі і гісторыі мастацтваў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

Вывучэнне дысцыпліны “Сацыяльна-культурная дзейнасць” (тэорыя, методыка, менеджмент і маркетынг) дапамагае выпускніку *засвоіць* паняцце, сферу і прызначэнне СКД, месца і ролю асветніцкай дзейнасці ў гісторыі Беларусі, прынцыпы кіравання, арганізацыі і метадычнага забеспячэння СКД, асаблівасці менеджменту і маркетынгу СКД; *умець* аналізаваць сучасны стан, эфектыўнасць, кірункі і перспектывы развіцця СКД, распрацоўваць асноўныя віды метадычнай прадукцыі для забеспячэння СКД, арганізоўваць СКД у адпаведнасці з профілем спецыялізацыі ў дзяржаўных установах, ажыццяўляць дзейнасць па менеджменце і маркетынгу таварнай прадукцыі (тавараў і паслуг), выробленай ў галіне народнай творчасці.

Кампанент агульнапрафесійных дысцыплін ВНУ забяспечвае падрыхтаванасць выпускніка да арганізацыйна-кіруючай, даследчай дзейнасці ў галіне культуры і мастацтва, народнай творчасці.

Сярод агульнапрафесійных дысцыплін вылучаецца кампанент, засвоіўшы які, выпускнік павінен авалодаць *ведамі* аб гісторыі і сучасным стане традыцыйнай нематэрыяльнай і матэрыяльнай культуры беларусаў (фальклоры, міфалогіі, этнаграфіі) як дакументальнай аснове арганізацыі народнай творчасці, лагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудове візуальнага і тэкставага рада, аб разуменні прыгажосці ў розных часавых і стылістычных эпохах, асноўных нарматыўных дакументах па ахове інтэлектуальнай уласнасці, метадах і сродках удасканалення ўласнай інфармацыйнай культуры, магчымасцях выкарыстання баз даных па народнай творчасці; *уменнямі* выкарыстоўваць прафесійную беларускамоўную лексіку, тэарэтычныя і практычныя веды ў дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання, лагічна будаваць візуальны і тэкставы рад, выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці асноўныя нарматыўныя дакументы па ахове інтэлектуальнай уласнасці, выкарыстоўваць агульнатэарэтычныя веды і навыкі ў працэсе аналізу і даследавання народнай творчасці, працаваць з разнастайнымі базамі даных па народнай творчасці.

Комплекс дысцыплін па выбары студэнта пашырае і замацоўвае арганізацыйныя і даследчыя веды, уменні і навыкі ў абранай прафесіі.

Важнейшую ролю ў аваладанні тэхналогіяй прафесійнай дзейнасці адыгрываюць спецыяльныя дысцыпліны. Так, у выніку вывучэння дысцыпліны “Этнапедагогіка” выпускнік павінен *ведаць* сучасныя канцэпцыі этнасу як біясацыяльнага аб’яднання людзей, месца этнічнай культуры ў працэсах этнаэкалогіі, адрозненні фармальнай і нефармальнай адукацыі ў кантэксце этнаэкалогіі, структуру этнічнай псіхалогіі, духоўныя вытокі народнай педагогікі, методыкі фарміравання этнаэкалагічна арыентаванай асобы, методыкі фарміравання сенсітыпу носьбіта этнічнай культуры; *умець* выкарыстоўваць у занятках народнай творчасцю веды пра функцыянальнасць этнічнай культуры ў працэсах этнаэкалогіі, выкарыстоўваць у занятках народнай творчасцю сродкі фармальнай і нефармальнай адукацыі, веды пра структуру этнічнай псіхалогіі, даносіць да навучэнцаў духоўныя вытокі народнай педагогікі, выкарыстоўваць методыкі фарміравання этнаэкалагічна арыентаванай асобы, выкарыстоўваць методыкі фарміравання сенсітыпу носьбіта этнічнай культуры.

Засваенне дысцыпліны “Нематэрыяльная традыцыйная культура беларусаў” абавязвае выпускніка *ведаць* сістэму міфапаэтычнай спадчыны народа, ступені яе навуковага даследавання і запатрабаванасці ў сучаснай культуры, прыкладную адрасацыю нематэрыяльнай культурнай спадчыны да этапаў старажытнай гісторыі Беларусі згодна Э.М.Загарульскаму, агульнатэарэтычныя пытанні беларускай фалькларыстыкі і асноўныя крыніцы навуковай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі па фальклоры, важнейшыя віды абрадавай і пазаабрадавай народнай творчасці, іх ідэйны змест і сістэму жанраў, унікальныя і адметныя з'явы традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, асноўныя метады фалькларыстычных даследаванняў і методыку збіральніцкай працы; *умець* аналізаваць фальклорныя творы з пункту гледжання іх архаікі, прыналежнасці да таго ці іншага абраду ці да пэўнай сістэмы жанраў, выяўляць найбольш дасканалыя ў мастацкіх адносінах узоры фальклорных твораў і іх сувязь з іншымі часткамі духоўнай культуры, самастойна працаваць з навуковай літаратурай, з першакрыніцамі па прадмеце, творча падыходзіць да інтэрпрэтацыі беларускай міфалогіі ў будучай прафесійнай дзейнасці, карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях фалькларыстыкі і сумежных з ёй дысцыплін.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Матэрыяльная традыцыйная культура беларусаў” студэнт павінен *ведаць* гісторыю этнакультурнага вывучэння беларусаў, асаблівасці матэрыяльнай традыцыйнай культуры беларусаў, этапы развіцця драўлянага дойлідства Беларусі, асноўныя народныя промыслы і рамёствы, тэхналогію іх вырабу і практычнае выкарыстанне, асаблівасці традыцыйнага беларускага касцюма згодна з даследаваннямі М. Раманюка, асаблівасці этнічнага абрадавага і паўсядзённага харчавання, карыстацца пісьмовымі крыніцамі па этнаграфіі; *умець* праводзіць самастойныя палявыя даследаванні матэрыяльнай культуры з мэтай фіксацыі лакальна-рэгіянальных асаблівасцей, адрозніваць народныя строі розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, вызначаць канструктыўныя асаблівасці, колеравую гаму, арнаментальныя кампазіцыі, выкарыстоўваць у паўсядзённым побыце асобныя народныя рамёствы.

Пасля засваення дысцыпліны “Аўдыёвізуальная антрапалогія” выпускнік абавязаны ведаць: асноўныя этапы станаўлення даследаванняў фальклорнай традыцыі беларусаў, абрадавую карту і сакральную тапаграфію беларусаў, навуковую спадчыну найбольш вядомых збіральнікаў і даследчыкаў беларускага фальклору, даследаванні З.Я.Мажэйка, І.Д.Назінай у галіне аўдыёвізуальнай антрапалогіі і спосабы фіксацыі і публікацыі іх вынікаў; *умець* праводзіць фальклорную палявую практыку, фіксаваць на лічбавых носьбітах, расшыфроўваць і архіціраваць экспедыцыйныя матэрыялы, арыентавацца ў жанравых асаблівасцях фальклорнай

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

спадчыны беларусаў, аналізаваць мастацка-вобразную сістэму фальклорных жанраў.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Этнафонія спеўнай суполкі” выпускнік павінен *ведаць* гісторыю і тэорыю этнафоніі, распрацаваныя ўсходнееўрапейскімі навукоўцамі, законы існавання, аховы і пераемнасці спеўных навыкаў ва аўтэнтычных калектывах Беларусі, асноўныя прынцыпы гуртавых спеваў у набліжанай да аўтэнтычнай спеўнай манеры, прынцып фарміравання на дакументальнай аснове рэпертуару спеўнай этнафанічнай суполкі, методыку работы педагога-лідэра са спевакамі ў спеўнай суполцы, стадыі і формы рэпетыцыйнага працэсу спеўнай суполкі; *умець* наладзіць працэс пошуку, развучвання і выканання рэпертуару спеўнай суполкі, складзенага на дакументальнай аснове, выкарыстоўваць асноўныя прынцыпы фаніравання ў гуртавых спевах, перадаваць рэгіянальныя асаблівасці беларускага спеўнага фальклору ў галіне інтанавання і гуказдабывання, карыстацца асноўнымі прыёмамі фаніравання і інтанавання пры выкананні каляндарных і сямейна-абрадавых песень, валодаць прынцыпамі мастацка-эстэтычнага кіравання дзейнасцю аматарскіх і прафесійных калектываў, улічваць асабістыя творчыя асаблівасці спевака, неабходнасць імправізацыі і самавыяўлення пры стварэнні гуртавога гуку ў фальклорных спевах.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Практычная этнафонія” выпускнік павінен *ведаць* асноўныя этапы станаўлення, асноўных прадстаўнікоў-навукоўцаў і тэорыю беларускай этнамузыкалогіі, законы вуснай перадачы фальклорнай традыцыі, асноўныя прынцыпы інтанавання і гуказдабывання ў сольных беларускіх традыцыйных спевах, рэгіянальныя асаблівасці сольных беларускіх традыцыйных спеваў, асноўныя методыкі работы з фальклорнай песняй, стадыі і формы рэпетыцыйнага працэсу пры назапашванні і развучванні традыцыйнага спеўнага матэрыялу; *умець* выкарыстоўваць тэарэтычныя і практычныя веды ў галіне беларускай спеўнай этнафоніі, арганізоўваць працэс развучвання традыцыйных спеваў і кіраваць ім, выкарыстоўваць навыкі, атрыманыя ў аўдыторных умовах у канцэртнай і абрадава-святочнай практыцы, валодаць прынцыпамі мастацка-эстэтычнага кіравання дзейнасцю спевакоў, якія выконваюць фальклорныя песні ў манеры, набліжанай да аўтэнтычнай, улічваць творчыя асаблівасці традыцыйных спеваў пры стварэнні канцэртных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праграм, у сацыякультурнай дзейнасці, дзейнасці па этнакультурным выхаванні, прымяняць веды ў галіне практычнай этнафоніі для выкладчыцкай дзейнасці.

Пасля вывучэння дысцыпліны “Народны інструмент” выпускнік павінен *ведаць* гісторыю і тэорыю беларускага і замежнага інструментазнаўства, наменклатуру асноўных беларускіх народных інструментаў у адпаведнасці з класіфікацыей Закса-Харнбостэля, асноўныя склады беларускай інструментальнай капэлы, законы існавання, аховы і пераемнасці навыкаў інструментальнага выканання ў аўтэнтычных калектывах, рэгіянальныя асаблівасці арганізацыі выканаўства на беларускіх народных інструментах, асноўныя прынцыпы акампанементу спевам на народных інструментах; *умець* настраіваць і даглядаць народны інструмент, выконваць асноўныя беларускія побытавыя танцы на народным інструменце, рабіць эстэтычна і стылістычна вытрыманыя ў традыцыі рэканструкцыі найгрышаў па захаваных аўдыё і вербальных дакументах, наладзіць працэс пошуку, развучвання і выканання народнай інструментальнай музыкі, удзельнічаць у гуртавым інструментальным выкананні, кіраваць працэсам падрыхтоўкі акампанементу да спеваў і побытавых танцаў.

Вывучэнне дысцыпліны “Клас фальклорнага выканаўчага майстэрства” дазваляе студэнту *ведаць* адрозненні сцэнічнай, фестывальнай, абрадавай, канцэртнай практыкі фальклорнага калектыву, наменклатуру, каляндарную і рэгіянальную прыналежнасць асноўных народных гульняў і побытавых танцаў беларусаў, патрабаванні да псіхалагічных, вакальных, гендэрных, камунікатыўных асаблівасцей удзельнікаў фальклорнага калектыву, стадыі і формы рэпетыцыйнага працэсу фальклорнага калектыву; *умець* арганізаваць рэпетыцыйны працэс фальклорнага калектыву, забяспечыць функцыянальнасць і запатрабаванасць рэпертуару калектыву, выконваць і развучваць асноўныя народныя гульні і побытавыя танцы беларусаў, працаваць са спеўным гукам калектыву, валодаць сродкамі пошуку інфармацыі для арганізацыі канцэртнай, фестывальнай дзейнасці фальклорнага калектыву.

Кампанент спецыяльных дысцыплін ВНУ забяспечвае падрыхтаванасць да творчай, даследчай і педагагічнай дзейнасці ў галіне культуры і мастацтва. У выніку вывучэння дысцыплін кампанента ВНУ выпускнік павінен *ведаць* патрабаванні народнай гаспадаркі ў спецыфіцы існавання народнай творчасці ва ўмовах горада і вёскі ў кантэксце этнаэкалогіі, тэхналогію арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчага працэсу, аптымальна адаптаванага да ўмоў сучаснай народнай гаспадаркі краіны, асноўныя палажэнні і методыкі выкладання народнай творчасці прадстаўнікам розных узроставых груп, асаблівасці прафесійнай педагагічнай дзейнасці ў галіне народнай творчасці, адпаведнай кірунку спецыяльнасці, спецыфіку фарміравання і ўдасканалення інфармацыйнай культуры спецыяліста ў галіне народнай творчасці; *умець* адаптаваць формы і метады арганізацыі народнай творчасці да ўмоў яе існавання ў вёсцы і горадзе, распрацоўваць календарныя і вучэбныя планы і праграмы для арганізацыі дзейнасці творчых калектываў, арганізоўваць дзейнасць аматарскіх і прафесійных творчых калектываў, з улікам асаблівасцей прафесійнай педагагічнай дзейнасці ў галіне народнай творчасці, адпаведнай кірунку спецыяльнасці, фарміраваць на выверанай навукова-матадычнай аснове і пастаянна ўдасканальваць уласную інфармацыйную культуру спецыяліста ў галіне народнай творчасці.

Комплекс дысцыплін па выбары студэнта пашырае і замацоўвае творчыя і педагагічныя веды, уменні і навыкі ў абранай прафесіі. Пры вывучэнні дысцыплін па выбары выпускнік авалодвае больш шырокім дыяпазонам ведаў, якія садзейнічаюць развіццю яго прафесійных здольнасцей. Пры вывучэнні дысцыплін па выбары выпускнік павінен навучыцца выкарыстоўваць атрыманыя веды ў практычнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыплін спецыялізацыі выпускнік павінен *ведаць* методыку выкладання творчых дысцыплін, прыёмы мастацкага афармлення вынікаў творчай дзейнасці, спецыфіку работы з PR-тэхналогіямі для захавання і развіцця народнай творчасці, забеспячэння патрэб насельніцтва на вынікі творчай дзейнасці спецыялістаў, асноўныя творчыя метады вядучых дзеячаў абранай прафесійнай галіны мастацтва (беларускіх і замежных), гісторыю і тэорыю сучаснай мастацкай крытыкі; *умець* выкладаць творчыя дысцыпліны, выкарыстоўваць прыёмы мастацкага афармлення вынікаў творчай дзейнасці, працаваць з PR-тэхналогіямі для захавання і развіцця народнай творчасці, забеспячэння попыту насельніцтва на вынікі творчай дзейнасці спецыялістаў, ужываць асноўныя творчыя метады вядучых дзеячаў абранай прафесійнай галіны творчасці (беларускіх і замежных), прааналізаваць практычныя вынікі творчасці і даць ім крытычную ацэнку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацаваным стандартам прадугледжаны патрабаванні да зместу і арганізацыі практыкі. Практыка (вучэбная, педагагічная, фальклорная, пераддыпломная) з'яўляецца часткай адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў, працягам навучальнага працэсу ў вытворчых умовах і праводзіцца ва ўстановах культуры, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання. Практыка накіравана на замацаванне ў вытворчых умовах ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе навучання ў ВНУ, авалоданне навыкамі вырашэння сацыяльна-прафесійных задач, вытворчымі тэхналогіямі. Яна арганізуецца з улікам будучай спецыяльнасці і спецыялізацыі.

*Змест вытворчай практыкі* ўключае вывучэнне вопыту работы творчага калектыву (прафесійнага і аматарскага, студыі), Палаца культуры, цэнтраў эстэтычнага выхавання, устаноў культуры, устаноў пазашкольнага навучання і выхавання, навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці, творчых саюзаў; набыццё вопыту прафесійнай працы; правядзенне неабходных навукова-метадычных даследаванняў; ацэнка стану метадычнага і тэхнічнага забеспячэння дзейнасці ўстановы; ацэнка ступені інфарматызацыі і аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў ва ўстанове; распрацоўка рэкамендацый па інфарматызацыі дзейнасці ўстановы; удзел у выкарыстанні і распрацоўцы аўтаматызаваных сродкаў падтрымкі дзейнасці ўстановы.

*Змест педагагічнай практыкі* складаюць аналіз існуючых праграм па творчых дысцыплінах для 1-11 класаў сярэдняй школы з мастацка-творчым (эстэтычным) ухілам; распрацоўка канспектаў і правядзенне ўрокаў па творчых прадметах; авалодванне методыкай арганізацыі правядзення ўрокаў і выхаваўчай работы ў навучальнай установе; распрацоўка плана-канспекта і правядзенне аднаго пазакласнага мерапрыемства з удзелам вучняў і іх бацькоў; выкананне індывідуальнага задання.

*Змест фальклорнай практыкі* прадугледжвае наведванне руральных (вясковых) асяродкаў бытавання традыцыйнай культуры беларусаў; вывучэнне асноўных дакументаў фальклырыстаў-прафесіяналаў па даследаванні з'яў традыцыйнай культуры, якія з'яўляюцца прадметам практыкі; фіксаванне і апісанне з'яў традыцыйнай культуры (абраду, творчых імпрэз, тэхналогій) з пункту гледжання структуры і зместу; удзел у арганізацыі і правядзенні абраду, творчых імпрэз, выкарыстанне традыцыйных тэхналогій народнага дэкаратыўна-побытавага мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтам; выканаўцы; адаптацыя атрыманых вынікаў з улікам дыдактычнага матэрыялу па спецыяльных дысцыплінах і дысцыплінах спецыялізацыі, дакументальнай асновы дыпломнай работы (праекта).

*Пераддыпломная практыка* з'яўляецца заключным этапам прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста да практычнай дзейнасці. Мэта практыкі – завяршэнне фарміравання прафесійных і арганізацыйных уменняў праз даследчую, эксперыментальную, укараняльную дзейнасць студэнта над практычнай часткай сваёй дыпломнай работы. Сярод асноўных задач практыкі – выпрацоўка навыкаў інавацыйнай дзейнасці ў сферах культуры і мастацтва; замацаванне ўсяго комплексу ведаў па дысцыплінах спецыялізацыі ў адпаведнасці з абраным кірункам; збор і абагульненне інфармацыі па тэме дыпломнай работы; апрабацыя распрацовак і галоўных вынікаў дыпломнай работы. Змест практыкі кожнага студэнта вызначаецца індывідуальна. Вынікі практычнай часткі (пастаноўка відовішча, стварэнне мастацкага твора і інш.) абгрунтоўваюцца і аналізуюцца ў пісьмовай дыпломнай рабоце (праекце).

Распрацаваны стандарт па спецыяльнасці “народная творчасць (фальклор)” з'яўляецца мадэллю падрыхтоўкі кадраў для галіны традыцыйнай народнай культуры Беларусі. Яго рэалізацыя ў навучальным працэсе БДУ культуры і мастацтваў павінна забяспечыць сацыяльна-культурную сферу краіны высокакваліфікаванымі спецыялістамі, кампетэнтнымі ў праблеме бытавання, вывучэння і пераймання аўтэнтычнага фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ